


## У НУМАРЫ


| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
| --- | --- |
| **З удзячнасцю за ўвагу: нарыс аб супрацы са СМІ** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Музей беларускай маляванкі: меркаванні з кнігі водгукаў** | **Конфессиональная жизнь Заславщины в конце XVIII – первой половине XIX вв.** |


## ***Навіны***

### З удзячнасцю за ўвагу: нарыс аб супрацы са СМІ

Вельмі цешыць тая акалічнасць, што прадстаўнікі айчынных СМІ маюць вялікі і шчыры інтарэс да Заслаўя, які робіцца вынікам усё новых і новых рэпартажаў, прысвечаных яго гісторыі, адлюстраванай праз прызму працы нашага музея-запаведніка, які дапамагае здзейсніць усім зацікаўленым захапляльнае падарожжа ў мінулае.




*Этнаграфічны комплекс музея-запаведніка, млын, эфір тэлеканала “АНТ” 5 чэрвеня*

Мы шчыра ўдзячны ўсім прадстаўнікам СМІ, якія спрычыніліся і зараз спрычыняюцца да адкрыцця багатай гісторыі Заслаўя шырокаму колу грамадскасці, якія зрабілі свой унёсак у асветніцкую працу, вельмі карысную і патрэбную ва ўсе часы.

У бягучы момант даволі значны інтарэс СМІ выклікаў да сябе наш новы аб'ект – Музей беларускай маляванкі. Гэта цалкам натуральна, бо ўсё раней не бачанае вельмі цікава спазнаваць, усё раней не бачанае ў сферы гісторыі і культуры валодае вялікай атрактыўнасцю, эмацыянальнай насычанасцю, патэнцыял якой нельга не ўлічваць у пазнавальнай, асветніцкай працы. Аднак, інтарэс выклікае не толькі новы аб'ект, але і тыя, што існуюць здаўна, аб чым будзе сказана ніжэй.




*З новым выставачным праектам гледачоў тэлеканала “АНТ” знаёміць Ксенія Сямашка, эфір 5 чэрвеня*

5 чэрвеня этнаграфічны, а таксама музейна-выставачны комплексы нашага музея-запаведніка наведала здымачная група тэлеканала “АНТ” на чале з Аляксандрам Мацясам. Асаблівую цікавасць Аляксандр праявіў да новага выставачнага праекта *“Камяні млынара. Вяртанне... З гісторыі сям'і Мяхедак-Савіцкіх – заслаўскіх млынароў і мінскіх майстроў ды каменацёсаў”* (у межах аўтарскай серыі “Этнаграфіка рэчавіду”). Дапамогу ў знаёмстве з выставачным праектам аказала Ксенія Сямашка – намесніца дырэктара музея-запаведніка па навуковай працы; знаёмства з пастаяннай экспазіцыяй “Гандлёвая лаўка канца XIX – пачатку XX стст.” (далей – Лаўка) здзейсніў Аляксандр Рак – галоўны захавальнік фондаў музея-запаведніка.

Падрыхтаваны матэрыял выйшаў у эфіры перадачы “Наши Новости” тэлеканала “АНТ” 5 чэрвеня.

9 чэрвеня Музей беларускай маляванкі наведала здымачная група тэлеканала “СТВ” (журналіст – Ангеліна Валькові́ч, аператар – Андрэй Кульгавы). У справе знаёмства з новым аб'ектам музея-запаведніка значную дапамогу здымачнай групе аказалі нашы старшыя навуковыя супрацоўнікі: Інэса Сабалеўская (аддзел музейнай педагогікі) і Ірына Арцем'ева (аддзел фондаў). Падрыхтаваны ў выніку актыўнай супрацы-дыялога рэпартаж пабачыў свет 12 чэрвеня ў межах эфіра перадачы “Міншчына” на тэлеканале “СТВ”.




*Аляксандр Рак знаёміць гледачоў тэлеканала “АНТ” з Лаўкай, эфір 5 чэрвеня*

Заслаўскі гісторыка-культурны музей-запаведнік, у сваю чаргу, шчыра запэўнівае, што заўжды адкрыты да супрацы з айчыннымі СМІ і гатовы аказваць ім усебаковую дапамогу ў асвятленні дзейнасці нашай Установы, а таксама ў сферы трансляцыі гісторыі Заслаўя розных перыядаў, з мэтай інфармавання шырокага кола грамадскасці.

**Музей беларускай маляванкі: меркаванні з кнігі водгукаў**

Новы аб'ект нашага музея-запаведніка – Музей беларускай маляванкі, аб адкрыцці якога пісалася ў папярэднім нумары “Заслаўскіх збораў”,

прыцягнуў і працягвае прыцягваць да сябе значную ўвагу шырокага кола наведвальнікаў. Аб гэтым яскрава сведчаць меркаванні людзей, пакінутыя ў асобнай кнізе водгукаў, заведзенай менавіта для гасцей, што завіталі ў Музей беларускай маляванкі. Звернемся менавіта да іх: да яскравых уражанняў і разважанняў, выкліканых індывідуальнай інтэрпрэтацыяй убачанага і адчутага.

*“Дзякуй вялікі ўсім, хто задумаў, сабраў, пабудаваў і адкрыў музей беларускай маляванкі. Я асабіста ведала сп. Юрася Малаша, ініцыятара збору маляваных дываноў і спадчыны Язэпа Драздовіча. Я думаю, ён на небе радуецца, што яго мара споўнілася. Дзякуй адміністрацыі Заслаўскага музея за новы ўнікальны музей, у якім захоўваецца культурны код беларускага народа – прага да Бога, любові і гармоніі”* (сям'я Дайнекаў, 20 мая).




*Вокладка кнігі водгукаў Музея беларускай маляванкі*
*/аўтар арыгінальнай вокладкі – заслаўскі майстар Наталля Бічэўская/*

*“Спасибо! за интересную экспозицию, открыли ещё раз многообразие нашей культуры, самобытность нашего народа. Спасибо! За сохранение и культивирование нашей истории и культуры” (семья Кокоревых, г. Минск, 20 мая).*

*“Вялікі дзякуй, нізкі паклон за такую працу, цудоўны музей, яркую экспазіцыю. Жадаем плённай працы, цікавых праектаў і ўдзячных наведвальнікаў”* (калегі з Нацыянальнага мастацкага музея, 23 мая).

“*Очень понравилось в вашем музее. Спасибо за такую возможность увидеть эти произведения искусства своими глазами. Приятная атмосфера, доброжелательные и интересные работники”* (Гилязетдинова О.В., 25 мая).

*“Впечатления необыкновенные. Очень тёплые картины, заставляют подумать о сказачном, вспомнить детство, увидеть любовь. Появляется большое желание творить!”* (гости из Гомеля, 28 мая).

*“Ганаруся кожным чалавекам, хто і ідэяй, і працай, і думкамі, і дапамогай дакрануўся да стварэння гэтай “скарбонкі цудаў” – музея беларускай маляванкі! Сто лят! Да хуткай сустрэчы!”* (Клімава Алёна, г. Гродна, 30 мая).

*“Дзякуй вялікі за цудоўны музей! Вельмі шмат працы ўкладзена і крэатыву. Бачны сучасны погляд на музейную справу”* (Кацярына, Кірыл і Іван, 10 чэрвеня).

*“У Беларусі стварыўся цудоўны музей сусветнага ўзроўню. За ідэю і за яе цудоўную рэалізацыю дзякуй усім, хто спрычыніўся. Найлепшыя пажаданні поспехаў і плёну супрацоўнікам. Маляваныя дываны цяпер маюць сваю хату...”* (С. Высkварка, 11 чэрвеня).

*“Маляванка — это отражение души беларуского народа. В сюжетах, формах, композициях и сочетаниях цветов можно разглядеть уходящий мир беларуской деревни, образ рая, к которому стремилась душа беларуса. Огромная благодарность организаторам и работникам музея за бережное и трепетное отношение к беларуской культуре. Желаю процветания и развития!”* (Узлов И.С., Зеленоград (Москва), 11 июня).

*“Ваш музей яшчэ вельмі малады, але перспектыўны! Дзякуй за захаванне беларускіх традыцый і магчымасць “дакрануцца вокам” да мастацкай творчасці нашых продкаў! Жадаем поспехаў!”* (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, факультэт пачатковай адукацыі, 13 чэрвеня).

*“Большое спасибо за погружение в мир творчества. Видеть своими глазами, чувствовать — это большой дар. С благодарностью и надеждой на новые встречи” (Н.Г. Рубан, 23 июня).*

*“С наилучшими пожеланиями от курсантов 2-го курса следственно-экспертного факультета учреждения образования Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь”* (24 июня).

*“Огромная благодарность сотрудникам Музея! Очень интересная, необычная экспозиция. Шикарные, бесценные экспонаты. Было очень познавательно! Обязательно приедем вместе с нашими учащимися”* (коллектив педагогов лицея БНТУ, 28 июня).

***Навуковая праца***

**Заслаўе ў беларускай культуры**

Захаванне гісторыі і культуры Айчыны – гэта, без пераўвелічэння, частка дзяржаўнай праграмы, якая ўплывае на патрыятычнае выхаванне насельніцтва, складаванне чалавека як асобы і грамадзяніна. Дадзеная праграма рэалізуецца на працягу многіх дзесяцігоддзяў і складваецца з самых разнастайных накірункаў. Адным з такіх накірункаў з'яўляецца стварэнне помнікаў, а асабліва – скульптурных кампазіцый або скульптур, прысвечаных гістарычным асобам. Дадзены тып помнікаў з'яўляецца вельмі ўдалым з пункту гледжання ўздзеяння на гледача, яго эмоцыі, на складаванне ўяўлення аб вобразах гістарычных персанажаў, атаясамлення помнікаў з месцам (населеным пунктам; асацыятыўная прывязка), у якім ён усталяваны. Далёка не кожны населены пункт Беларусі на дадзены момант можа пахваліцца наяўнасцю ўдалых помнікаў у выглядзе скульптур і скульптурных кампазіцый. Заслаўю ж у згаданым вышэй сэнсе пашчасціла, і гэта невыпадкова, бо тут выявілася даніна вялікаму значэнню Заслаўя ў гісторыі і культуры Беларусі, аб чым і працягнем развaжаць ніжэй.



*Помнік Рагнедзе і Ізяславу, усталяваны ў 1993 г.; перасунуты бліжэй да ўвахода ў Дом культуры ў 2014 г.*

У Заслаўі найбольшай увагі заслугоўваюць два помнікі, адзначанага вышэй кшталту, – скульптурная кампазіцыя, прысвечаная Рагнедзе

(Гарыславе, Анастасіі) і Ізяславу, а таксама асобны помнік у гонар князя Ізяслава, ад чыйго імя пайшла назва нашага горада. Цікава тое, што аўтарамі гэтых помнікаў сталіся майстар-настаўнік (у першым выпадку) Анатоль Арцімовіч і яго выхаванец (у другім выпадку) Аляксандр Прохараў, але былі яны створаны з розніцай у 30-ць гадоў.



*Помнік князю Ізяславу, усталяваны ў 2014 г.*

*Скульптурная кампазіцыя, прысвечаная Рагнедзе і Ізяславу*, адлітая з бронзы, размяшчаецца побач з гарадскім Домам культуры “Світанак” (вул. Савецкая, 93/2). Аўтарамі кампазіцыі з'яўляюцца **скульптар Анатоль Арцімовіч і архітэктар Ігар Марозаў**, якія ўсталявалі яе ля Дома культуры ў 1993 г. Дарэчы, дадзеная работа была высока ацэнена на дзяржаўным узроўні: у 1998 г. Анатоль Арцімовіч быў уганараваны за яе Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Скульптурная кампазіцыя складаецца з двух персанажаў: Рагнеды (прыўзняўшыся, у пакорлівай паставе трымае над сабой карону, выраз твару – пакутлівы) і яе сына Ізяслава, які тут паказаны ў дзіцячым узросце (хлопчык стаіць за спіною маці, абараняе яе, выраз твару – рашучы). У ёй адлюстраваны той эпізод летапіснай гісторыі, які яшчэ са школы ведае, пэўна, кожны беларус – аб тым, як малы сын Ізяслаў прыйшоў на ратунак сваёй маці Рагнеды, якую мусіў пакараць смерцю бацька і муж Уладзімір. Гісторыя нібыта ажывае перад вачыма. Бронзавая кампазіцыя ўсталявана

на падмурку, складзеным з палявых валуноў, што характэрна для беларускай традыцыі муроўкі.




*У майстэрні Аляксандра Прохарава. Майстар-скульптар з эскізам помніка князю Ізяславу, 2014 г. /грамадска-асветніцкая газета “Культура”, №31 (1157), 02-08.08.2014 г./*

*Помнік, прысвечаны заснавальніку горада князю Ізяславу*, стаіць на месцы былой Рынкавай плошчы з 2014 г., побач з музейна-выставачным комплексам Заслаўскага музея-запаведніка (вул. Рынкавая, 4). Аўтарамі помніка з'яўляюцца **скульптар Аляксандр Прохараў і архітэктар – Сяргей Багласаў**. Фігура Ізяслава адліта з бронзы ў поўны рост, усталявана на каменным пастаменце. Ізяслаў паказаны дарослым, апрануты ў княскія адзенні, у яго руках – кніга і меч (мудрасць, паяднаная з сілай; адсылка да летапісных згадак аб “князі-кніжніку”, паратунку маці з мячом у руках, без

ваяўнічасці – меч скіраваны лязом уніз). Дадзены помнік вельмі дарэчны, бо дзякуючы яму можна не проста расказваць гасцям і жыхарам Заслаўя аб князі, у імя якога названы горад, але і паказаць яго, хай і прыкладны (ўяўлены аўтарам), затое матэрыяльны, дасяжны воку выгляд. Цікава, што эскізу помніка, дзе князь Ізяслаў выяўлены дарослым, было суджана стаць арыгінальнай скульптурай праз 10-ць гадоў ад часу стварэння ў майстэрні Аляксандра Прохарава, пасля ўсіх патрэбных дапрацовак, калі задума знайшла сваё запатрабаванне.

Такім чынам, скульптурныя кампазіцыі, прысвечаныя гістарычным асобам – Рагнедзе і Ізяславу, усталяваныя ў Заслаўі, чарговы раз пацвярджаюць высокае значэнне гэтага старажытнага горада для беларускай гісторыі і культуры. Магчыма, калісьці ўвасабленне ў помніках знойдуць і іншыя гістарычныя асобы, чыі жыццё і дзейнасць былі звязаны з Заслаўем: Яўнут (сын князя Гедзіміна), Ян Глябовіч, Сымон Будны і іншыя.

### *Да матэрыялаў канферэнцыі*

*Быў час, калі наш музей-запаведнік выступаў у якасці арганізатара і мадэратара канферэнцый. Яны адбываліся на працягу шэрагу гадоў. Ад іх працы захаваліся даволі цікавыя матэрыялы, якія друкаваліся ў спецыяльных зборніках. У гэтым нумары мы хочам Вам прапанаваць адзін з такіх матэрыялаў, які быў надрукаваны ў зборніку “Заслаўе. Карані нашага радаводу” ў 2011 г., па выніках канферэнцый, арганізаваных нашым музеем-запаведнікам. Звернемся да канфесійнай гісторыі Заслаўшчыны, на аснове артыкула кандыдата гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.М. Філатавай (Е.Н. Филатовой), які падаем галоўным чынам без змяненняў [апрача афармлення спасылак: зноскі пад тэкстам асобных старонак заменены квадратнымі дужкамі і спісам выкарыстаных крыніц і літаратуры (Список использованных источников и литературы), змешчаным пры канцы артыкула, таксама дададзены ілюстрацыі, падабраныя згодна са зместам]. Магчыма, калісьці традыцыя правядзення канферэнцый Заслаўскім музеем-запаведнікам адновіцца зноў [рэд.].*

### Конфессиональная жизнь Заславщины в конце XVIII – первой половине XIX вв.

В составе Речи Посполитой Заславщина находилась на территории Минского уезда и воеводства. Ее население было в основном католическим и униатским, а в местечке проживало и немногочисленное иудейское

*[население — ред.]*. Католические прихожане входили в состав Заславской католической парафии Радошковичского деканата Виленского католического епископства. Парафиальный костел был деревянным. В технике кирпичной кладки построен и в 1774 г. освящен костел в честь Рождества Наисвятейшей Девы Марии *[по другим источникам — освящен 8 сентября 1779 г.* — ред.]*. В Заславле находился и доминиканский монастырь (основанный в 1676 г.), который входил в состав Русской доминиканской провинции [1]. При монастыре был конвикт, шпиталь (богадельня), архив и библиотека и действовало ружанцовое братство. Здание монастыря было деревянным и построенным на развалинах старого замка. И как описывала "Живописная Россия", что в Заславле "в самом городе был другой замок, из развалин которого воздвигнут был впоследствии монастырь и костел доминиканов. Одна из готических башен костела составляла прежде замковую башню" [2]. Доминиканский костел был назван во имя Михаила Архангела.

После присоединения территории Минщины к Российской империи в 1793 г. католики вошли в состав Заславской католической парафии Минского деканата Минской католической епархии. По сообщению польского "Географического Словаря...", в первой половине XIX в. Заславская католическая парафия насчитывала до 2000 верующих. А в Заславле был костел Св. Николая, а также католические каплицы Свв. Космы и Дамиана в Мацках, Шаповалах, Чайковщизне и Гурках [3]. В 1854 г. в парафии было 2724 прихожан [4].



*На конец XVIII – пер. пол. XIX — доминиканский костел Михаила Архангела, затем — "подоминиканская" (доставшаяся от (после) доминиканцев — [ред.]) православная церковь; фото 1900 г., автор неизвестен*

По указу от 19 июля 1832 г. в Российской империи было закрыто 109 католических монастырей, среди них и Заславский доминиканский. Основными причинами для закрытия монастырей были участие монахов в восстании 1830 — 1831 гг. и немногочисленность братии ряда монастырей. К таким немногочисленным относился и монастырь в Заславле, в котором еще в 1818 г. проживало только 3 монаха и настоятель Клеменс Белинский. А для того чтобы монастырь оставался действующим и не переходил в разряд заштатных (неважно, был ли он православным, католическим или базилианским), по законам Российской империи нужно было 8 человек. Здание костела было передано на православную церковь. Деревянный парафиальный костел действовал до 1866 г.



*Чертеж “подоминиканской” церкви в Заславле, 1853 г.*

Информация польского “Географического Словаря...” вызывает некоторое сомнение, так как церкви Св. Николая, Преображения Господня и вышеперечисленные каплицы были не католическими, а униатскими. В начале 30-х гг. XIX в. в м. Заславль и населенные пункты Гурновичи, Липени, Мацки, Шаповалы входили в Заславский униатский приход Минского деканата Литовской униатской епархии. На территории этого прихода проживало 800 душ мужского пола (вместе с женщинами — около

1600 чел.) униатских прихожан. Приход имел 4 волоки и 8 моргов земли, 4 ревизских души крестьян мужского пола, а его фундушовый капитал составлял 668 рублей ассигнациями, и 100 рублей серебром давали другие доходы [5]. Деревянная церковь Преображения Господня была центром Заславского униатского прихода. П. Шпилевский в своей серии очерков "Путешествие по Полесью и Белорусскому краю", которые были опубликованы в журнале "Современник" в 1853 — 1855 годах, писал, что "единственное украшение Заславля в настоящее время составляет деревянная церковь во имя Преображения Господня. Стиль ее довольно отличный от древних церквей: она имеет форму старинного замка с башенками и шпицами; в башенках устроены какие-то комнатки, или, как называет народ, горенки; одна из них сохраняла следы некогда раскрашенных стен и какой-то надписи на балке, но ее никак нельзя разобрать" [6].

После ликвидации униатской церкви в 1839 г. и присоединения униатов к православию униатские храмы перешли к православной церкви. Архимандрит Николай писал, что в начале 60-х гг. XIX в. в Заславском православном приходе была каменная подоминиканская церковь с количеством прихожан 729 м.п. и 711 ж.п. *[мужского пола и женского пола — ред.].* К ней было приписано 2 деревянных кладбищенских церкви — мацковская Космо-Дамиановская и вязынская Покровская. В этом приходе были еще вязынская Преображенская и заславская Св.-Николаевская церкви, шаповаловская Ризоположенская, чайковщинская Св.-Николаевская и гурковщинская [7].

Территория Заславщины в первой половине XIX в. входила в состав Минского уезда и губернии. В конфессиональном плане Минский уезд был неоднородным. В 1859 г. на территории этого уезда православных было 30541 муж. и 32286 жен. (всего 62824), раскольников — 22 муж. и 25 жен. (47 чел.), католиков 15062 муж. и 15797 жен. (30859 чел.), протестантов — 48 муж. и 77 жен. (125 чел.), иудеев 3231 муж. и 3780 жен. (7011 чел.). Среди духовенства в этом же году было 214 православных священников и 3 монаха, 30 римско-католических, 1 кальвинистский и 13 раввинов.

### *Список использованных источников и литературы*

1. Litak S. Kościoł łaciński w Rzeczypospolitej około 1772 roku. Lublin, 1996. — S. 324, 505.
2. Słownik Geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T XIV. Warszawa, 1895. — S. 441, 442.
3. НИА Беларуси в Минске. Ф. 1871, оп. 32, д. 99. Л. 6 об. — 7.
4. Radwan M. Carat wobec kościoła greckokatolickiego w zaborze rosyjskim 1796 — 1839. Roma Lublin, 2001. — S. 255.

5. Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Мн., 1992. — С. 159.
6. Николай. Историко-статистическое описание Минской епархии. СПб, 1864. — С. 178.
7. Там же. Ф. 21, оп. 1, д. 5, л. 3 об. — 4.

* Дзянісаў, У.М. Заслаўскі парафіяльны касцёл / У.М. Дзянісаў // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Заслаўя / падрыхтавана выдавецкім цэнтрам БЕЛТА ; гал. рэд. Г.К. Кісялёў. – Мінск, 2000. – С. 86.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сямашка К.У., Арцем'ева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.